ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ЛІПЕНЬ ЖНІВЕНЬ

Віцебск 2017

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ліпень–жнівень 2017

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2017

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *А. В. Ігнаценка*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : ліпень–жнівень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2017. – 38 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорый карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2017

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ліпень–жнівень 2017

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 ліпеня па 31 жніўня 2017 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

1 ліпеня жыхары і госці Расоншчыны ўрачыста адзначылі 465-годдзе гарадскога пасёлка. Работнікі культуры падрыхтавалі святочную праграму «Славься, город родной!», у якой спалучылі дзень учарашні, сённяшні і заўтрашні. У рамках свята прайшоў раённы конкурс мясцовага касцюма «Мая Расоначка», маладзёжны музычны фестываль «Усе колеры маладосці», былі падведзены вынікі фотаконкурсу «Россоны и россонцы в объективе», раённай пазнавальнай віктарыны «Не зная края своего, всего ты мира не узнаешь» і інш.

2 ліпеня адбылася 58-я міжнародная сустрэча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху Беларусі, Расіі і Латвіі на Кургане Дружбы. Дэлегацыі ўзначальвалі старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў, губернатар Пскоўскай вобласці Андрэй Турчак і дэпутат сейма Латвіі Артур Рубікс. Разам з ветэранамі ўшанавалі памяць загінуўшых герояў Прошкаўскага падполля, партызанкі Марыі Пынто, Героя Савецкага Саюза Іманта Судмаліса шматлікія прадстаўнікі пасляваенных пакаленняў. Адбыліся паказальныя выступленні вайскоўцаў, святочны канцэрт творчых калектываў і выканаўцаў Пскоўскай вобласці, Касцёр Дружбы.

3 ліпеня Віцебшчына ўрачыста адзначыла Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Эпіцэнтрам урачыстасцяў у абласным цэнтры па традыцыі стала плошча Перамогі. Адбыўся ўрачысты мітынг і ўскладанне кветак і вянкоў да мемарыяльнага комплексу ў гонар савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў. У тэатральна-мастацкім шэсці былі адлюстраваны знакавыя падзеі сёлетняга года – 135-годдзе з дня

Кіраўнік кінастудыі «Летапіс» Талачынскага раённага Цэнтра культуры Дзмітрый Іўчанка ўвайшоў у лік фіналістаў конкурсу аматарскіх кароткаметражных фільмаў, які быў праведзены Магілёўскім цэнтрам гарадскіх ініцыятыў.

МЕРАПРЫЕМСТВЫ,

якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

25 чэрвеня ў в. Перабродцдзе Міёрскага раёна адбыўся традыцыйны фестываль народнай творчасці «Перабродская зорка». У «Горадзе майстроў» вырабы ручной работы дэманстравалі ўмельцы з Міёр, Браслава, Наваполацка. Гульнёвыя праграмы прадставілі Дзісненскі гарадскі Цэнтр культуры і Чапукоўскі СДК. Аб’яднанне «Наследие» пры Перабродскім СДК прапанавала стараабрадчыя стравы. Адбыўся канцэрт творчых калектываў культасветустаноў. Аматары літаратуры сабраліся на «Мацейкавай сялібе», дзе прайшлі літаратурныя чытанні. (*Міёрскія навіны. – 2017. – 8 ліп. – С. 8.*)

тэатр прапанаваў гледачу камедыю «Невеста напрокат». Маскоўскі «Театр на Юго-Западе» прывёз два спектаклі – «Игра в Наполеона» і «Макбет».

Адзін з самых маладых і паспяховых праектаў фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» – «**Лялечны квартал**». На сцэне Беларускага тэатра «Лялька» акрамя віцебскіх лялечнікаў з поспехам выступілі расійскія госці: Маскоўскі тэатр лялек з інтэрактыўным спектаклем «Поехали», Белгарадскі дзяржаўны тэатр лялек са спектаклем «Слон», Валгаградскі тэатр лялек «Колобок». Шведскі тэатр «Albatross» прывёз спектакль «Дзяўчынка і Марская Чарапаха». Украіну прадстаўлялі маладзёжны анімацыйны тэатр «ЕСТЬ» (Харкаў) і Ровенскі абласны акадэмічны тэатр.

30 ліпеня прэм'ерай спектакля «Дарослыя дзеці» па п'есе амерыканскага драматурга Леанарда Герша «Гэтыя вольныя матылькі» Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа завяршыў свой 91-ы сезон. Пастаноўка і музычнае афармленне заслужанага дзеяча мастацтваў Расійскай Федэрацыі Юрыя Пахомава. Сцэнаграфія і касцюмы Святланы Макаранкі. Пластыка Дзіяны Юрчанкі. У спектаклі занятыя заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова, акцёры Раман Салаўёў, Анастасія Рэўчанка, Аляксандр Базук.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

У жніўні былі праведзены два рок-фестывалі. Фестываль рок-музыкі «Навальніца» ў чарговы раз сабраў прыхільнікаў гэтага музычнага жанру ў аграгарадку Бігосава Верхнядзвінскага раёна. Арганізатары – раённы Дом культуры, РК ГА «БРСМ», раённая арганізацыя «Белая Русь», пагранкамендатура і бігосаўская пагранзастава. У Паставах рок-фестываль быў праведзены ў 12-ы раз. Арганізатар – Віктар Верацельнікаў, лідар мясцовага ВІА «Скіфы». Акрамя гаспадароў мерапрыемства сваю творчасць прадставілі рок-гурты з Мінска, Смаргоні і Нарачы.

нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, 130-годдзе з дня нараджэння Марка Шагала, Год навукі. Вячэрняя праграма сабрала віцяблян на святочны канцэрт «За сильную и процветающую Беларусь» і рэспубліканскую акцыю «Споем гимн вместе». У жыхароў Бешанковіч было двайное свята – у гэты дзень яны адзначылі 570-годдзе гарадскога пасёлка. У Шуміліне прайшло свята «Родная зямля», у рамках якога адбыўся раённы конкурс сярод вясковых маладых сем'яў «Уладар сяла-2017». У мерапрыемствах, прысвечаных Дню Незалежнасці і 240-годдзю прысваення статуса горада Гарадку, прыняла ўдзел дэлегацыя горада-пабраціма Бабаева Валгаградскай вобласці Расіі. Разам з сенненцамі галоўнае дзяржаўнае свята Рэспублікі Беларусь адзначыла дэлегацыя з г. Пачынак Смаленскай вобласці. Сіламі творчых калектываў расіян быў наладжаны канцэрт.

7 ліпеня Прэзідэнт Беларусі А. Р. Лукашэнка наведаў Аршанскі раён з рабочым візітам. Ён пазнаёміўся з вынікамі рэканструкцыі і добраўпарадкавання г. п. Копысь, наведаў шэраг аб'ектаў, у тым ліку помнік археалогіі Пятроўскі вал, Цэнтр народнай творчасці і рамёстваў, сустрэўся з жыхарамі гарпасёлка. У рамках візіту была абмеркавана канцэпцыя развіцця населеных пунктаў Беларусі з улікам стварэння камфортных умоў для жыцця людзей.

8 ліпеня шырока і разнастайна святкаваў Верхнядзвінск свой 631-ы дзень нараджэння. На ўрачыстасць да верхнядзвінцаў прыехалі дэлегацыі з гарадоў Валакаламска і Себежа Расіі, Краславы Латвійскай Рэспублікі, суседняга Наваполацка. Сваю творчасць гараджанам дарылі ў гэты дзень артысты верхнядзвінскай сцэны і ваенны духавы аркестр Полацкага пагранатрада. Падарункам ад Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі стаў вялікі канцэрт з удзелам кампазітара Эдуарда Ханка і зорак беларускай эстрады. Завяршылася свята феерверкам і маладзёжнай дыскатэкай.

8–9 ліпеня ў Рэспубліканскім свяце «Александрыя збірае сяброў», якое прайшло ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна Магілёўскай

вобласці, прынялі ўдзел майстры і творчыя калектывы з Віцебскага, Аршанскага, Талачынскага, Сенненскага раёнаў Віцебскай вобласці.

Свята сям'і, любові і вернасці адбылося **8 ліпеня** ў аграгарадку Сар'я Верхнядзвінскага раёна. Наведаць святочнае набажэнства перад іконай з часцінкай мошчаў святых благаверных князя Пятра і княгіні Фяўронні Мурамскіх у храме Успення Найсвяцейшай Багародзіцы збіраліся цэлымі сем'ямі. Акрамя жыхароў раёна сюды прыехалі госці з расійскага Валакаламска, Гродна, Полацка, Пастаў, Ушач. Сар'янскім сельскім Домам культуры была падрыхтавана канцэртная праграма «Исцеление любовью». Госці свята змаглі ацаніць работы ўдзельнікаў гурткоў СДК, пазнаёміцца з цікавай падборкай праваслаўнай літаратуры.

17 ліпеня міністр культуры Рэспублікі Беларусь Б. У. Святлоў наведаў Ушацкі раён. Галоўнай мэтай візіту стала пытанне капітальнага рамонту Ушацкага музея народнай славы імя Героя Савецкага Саюза У. Е. Лабанка. Міністр культуры наведаў музейную ўстанову і сустрэўся з культработнікамі ў раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці.

12–13 жніўня ў Докшыцах адбылося святкаванне 610-годдзя горада. На юбілей прыехала дэлегацыя латвійскага горада-пабраціма Балві на чале са старшынёй Краявой думы Айгарсам Пушпурсам. Дэлегацыю прадстаўнікоў горада-пабраціма Дзмітрыева Курскай вобласці ўзначаліў мэр горада Аляксей Рабыкін. Галоўным мерапрыемствам стаў другі «Фестываль дзвюх рэк», які мае статус рэспубліканскага свята. На фэсце можна было пачуць легенду пра ўзнікненне рэк Бярэзіны і Віліі, паслухаць выступленні творчых калектываў з тых рэгіёнаў, дзе працякаюць гэтыя рэчкі. Таксама арганізатары свята зладзілі абрад «Лебядзіная вернасць», прайшоў агляд-конкурс сямейнай творчасці, конкурс вакалістаў «Бярэзінскія напевы» і інш. (*Витебские вести. – 2017. – 15 авг. – С. 1, 4.*)

12–13 жніўня 53-годдзе горада адзначылі жыхары Новалукомля. У праграме: выступленні самадзейных калектываў, «Горад майстроў», рэтра-выстава аўтамабіляў, акцыя Чашніцкага РАНС «Гордимся, что научили». Кульмінацыяй свята стала ўрачыстая праграма «С днем

выстава «Угол зрения. Портрет». Аўтарам ідэі праекта, які аб'яднаў звыш сарака жывапісцаў, графікаў, фатографаў з Беларусі, Расіі і Латвіі, выступіў віцебскі мастак Леанід Мядзведскі. Куратар – гісторык мастацтва Людміла Хмяльніцкая.

У Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна» адкрыў сваю першую ў Беларусі выставу бельгійскі фатограф Эддзі Дзеўруй. Некалькі дзясяткаў работ увайшлі ў экспазіцыю «О чем не расскажут цвета?».

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

15–16 ліпеня ў рамках фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» было праведзена адкрытае абласное свята-конкурс майстроў разьбы па дрэве «Дрэва жыцця-2017». Удзельнічалі 37 прадстаўнікоў Беларусі, Расіі і Украіны. Журы, якое ўзначальваў старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Яўген Сахута, прысудзіла Гран-пры майстру Івану Супрунчыку з Брэсцкай вобласці.

Раённае свята «Узоры жыцця» ў межах праекта «У пошуках Спадчыны» прайшло ў вёсцы Котава Віцебскага раёна. Майстрыхі-вышывальшчыцы з усяго раёна прадставілі свае рукатворныя вырабы: сурвэткі, ручнікі, фіранкі, пасцельную бялізну, маляўнічыя карціны і дываны. Вартыя ўвагі былі і работы падрастаючага пакалення – членаў творчага аб'яднання «Чароўная нітачка» Вымнянскага СДК. У гэты дзень ушаноўвалі жыхароў вёскі Котава, выступалі дарослыя і дзіцячыя творчыя калектывы.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

З поспехам прайшлі традыцыйныя «**Тэатральныя сустрэчы**» на «Славянскім базары ў Віцебску». Міжнародны тэатральны цэнтр «Шанс» паказаў спектакль «Ты мне – я себе». Расійскае тэатральнае агенцтва «Арт-партнер XXI» прадставіла сола для зоркі з аркестрам «Джуди» з Нонай Грышаевай і Сяргеем Шусціцкім. Маскоўскі новы драматычны

базару» ладзіўся фестываль-конкурс барабаншчыц і мажарэтак, які сабраў 340 чалавек – удзельнікаў калектываў з Беларусі, Расіі і Эстоніі. Сярод асноўных мерапрыемстваў – вакальныя конкурсы. Журы Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2017» на чале з вядомай балгарскай спявачкай Іарданкай Хрыставай прысудзіла першую прэмію ўкраінскаму спеваку Уладу Сытніку. Беларускі спявак Ягор Шаранкоў заняў другое месца. Пераможцай XV Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу стала прадстаўніца Беларусі Марыя Магільная.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У рамках фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» ў Мастацкім музеі экспанаваліся выстава арыгінальных афортаў Рэмбрандта з італьянскага прыватнага збору Элізы Марэцці і ўнікальная калекцыя сярэднявечных кунтушовых паясоў беларускага калекцыянера Сяргея Казлоўскага.

У Друі Браслаўскага раёна адбыўся III Міжнародны пленэр, у якім удзельнічалі мастакі з Беларусі, Расіі і Галандыі. Арганізатар пленэру – пробашч парафіі Святой Тройцы Сяргей Сурыновіч. Сёлетнюю сустрэчу мастакі прысвяцілі 500-годдзю выдання Францыскам Скарынай Бібліі і назвалі яе «Скарынэр».

У аграгарадку Лужкі Шаркаўшчынскага раёна па ініцыятыве Культурна-асветніцкага цэнтра імя Язэпа Драздовіча **ў жніўні** быў праведзены 27-ы мастацкі пленэр. Творчая сустрэча 15 вядомых беларускіх мастакоў была прысвечана памяці ахвяр Халакосту. 5 жніўня адбылося падвядзенне вынікаў пленэру на выставе ў Лужкоўскім СДК.

У Мастацкай галерэі Полацка **ў ліпені-жніўні** экспанаваліся выстава «Літаратурныя шэдэўры ў ілюстрацыях беларускіх графікаў» і выстава «Віцебская школа гравюры». **24 жніўня** пачаўся пленэр графікі «Полацк у гравюрах сучасных мастакоў» з удзелам беларускіх майстроў графікі і мастакоў з Літвы.

У Віцебскім Цэнтры сучаснага мастацтва адкрылася міжнародная

рождения, любимый город! Город уюта и тепла!». Адбыўся канцэрт сталічнай арт-групы «Беларусы» і спявачкі Вікторыі Алешкі.

19 жніўня адбылося свята ў гонар 435-годдзя г. п. Бягомль Докшыцкага раёна. У праграме: мітынг каля памятнага знака ў гістарычнай частцы гарпасёлка, канцэрт-віншаванне з удзелам ансамбля «Землякі» Параф'янаўскага Дома культуры, падвядзенне вынікаў конкурсу «Таленты Бягомльшчыны». Працаваў тэматычны стылізаваны падворак «Бягомльшчына партызанская». На ім частку экспанатаў часоў Вялікай Айчыннай вайны прадэманстраваў музей народнай славы, зборнікі славутых пісьменнікаў-землякоў можна было пагартаць у бібліятэчным кутку.

26 жніўня ў Лёзне адбыліся святочныя мерапрыемствы з нагоды Дня горада. Арганізатары прапанавалі змястоўную культурную і спартыўную праграмы. Жадаючыя маглі наведаць тэматычныя пляцоўкі, кірмаш рамёстваў. Тэматычная пляцоўка Лёзненскай ЦБС «Есть чудо на земле с названьем дивным – книга» была прысвечана 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Супрацоўнікі Лёзненскага ваенна-гістарычнага музея арганізавалі фота-выставу «Квітней, Лёзненшчына!», сацыяльна-культурны фота-праект «Лёзна. Учора і сёння», акцыю «Я люблю Лёзна!». У рамках рэспубліканскага праекта «Беларусь – крыніца натхнення» РК ГА «БРСМ» і аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама правялі акцыю «Вышыванка для немаўляці» з мэтай захавання беларускіх традыцый. Павіншаваць лёзненцаў прыехалі творчыя калектывы Руднянскага раёна Смаленскай вобласці, якія прывезлі канцэртную праграму «Мы вместе».

26 жніўня ў г. Сянно прайшло святкаванне 575-годдзя горада. Свята пачалося ля крыніцы «Каплічка» тэатралізаванымі прадстаўленнямі «Ля вытокаў горада» і «Водная феерыя». Далейшыя дзеі свята праходзілі на цэнтральнай плошчы. Перад сенненцамі выступілі Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і духавы аркестр Пагранічных войскаў. На тэматычнай пляцоўцы быў

прадстаўлены фотапраект «Сенно: прошлое и настоящее», на «Бібліятэчным бульвары» размясцілася выстава літаратуры пра Сенненшчыну, паэты чыталі вершы пра родны край. Пасля святочнага феерверку адбыўся прагляд відэафільма «Битва под Сенно», знятага кінематаграфістамі з Санкт-Пецярбурга.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

1 ліпеня ў рамках святкавання 950-годдзя Оршы старшыня Аршанскага райвыканкама Леанід Пянькоўскі і глава горада Гагарына Смаленскай вобласці Генадзь Дзееў падпісалі пашыраны дагавор аб супрацоўніцтве, а з мэрам літоўскага горада Цяльшая было падпісана пагадненне аб асноўных накірунках супрацоўніцтва. Прадугледжана пашырэнне не толькі эканамічных, але і культурных сувязяў.

2 ліпеня было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Міёрскім раёнам і Падпарожскім муніцыпальным раёнам Ленінградскай вобласці. Партнёрства дапаможа рэалізоўваць не толькі эканамічныя праекты, але і развіваць культурныя сувязі. Расійскія госці пабывалі ў Дзісне, дзе сталі ўдзельнікамі святочных мерапрыемстваў у гонар Дня Незалежнасці Беларусі, а таксама наведалі мясцовую царкву, гістарычны музей, Дом рамёстваў. У Міёрах пазнаёміліся з візіт-цэнтрам заказніка «Ельня», з умовамі адпачынку ў дзіцячым санаторыі «Расінка», лепшымі самадзейнымі калектывамі.

3 ліпеня ў святкаванні Дня беларускай дзяржаўнасці на Ушаччыне прыняла ўдзел дэлегацыя з Тамашоўскага павета Лодзінскага ваяводства – рэгіёна-пабраціма. Польскія госці пабывалі ў Музеі народнай славы, пазнаёміліся з традыцыямі і ўнікальнымі майстрамі ў Цэнтры культуры і народнай творчасці, удзельнічалі ў святочных мерапрыемствах на мемарыяльным комплексе «Прарыў». **20 жніўня** дэлегацыя Ушацкага раёна пабывала ў якасці ганаровых гасцей на святкаванні «Дажынак» у Тамашоўскім павеце. У канцэртнай праграме з поспехам выступіла вакальная група «Ушачаначка». Вынікам візіту стала падпісанне

МАСТАЦТВА

«Отечество мое – в моей душе…» – гэтыя радкі Марка Шагала сталі лейтматывам свята ў гонар 130-годдзя з дня нараджэння мастака, якое адбылося **7 ліпеня** ў Віцебску. У Доме кіно дэманстраваўся дакументальны фільм «Марк Шагал. Нереальная реальность». У Мастацкім музеі адбылася прэзентацыя выставы фотадакументаў. Коласаўскі тэатр паказаў спектакль «Шагал… Шагал…». У музейным дворыку на вуліцы Пакроўскай прайшло традыцыйнае свята «У гасцях у Марка і Бэлы». Тут адбыўся канцэрт у выкананні ансамбля «Шалом» з Ліды. Артысты Беларускага тэатра «Лялька» паказалі спектакль «Шагал. Зыход». Творчая група пад кіраўніцтвам Ларысы Данчанкі арганізавала арт-перфоманс «Васильковое небо». У зале Цэнтра сучаснага мастацтва «Арт-пространство «Толстого, 7» віцебскія жывапісцы і графікі адкрылі выставу-прысвячэнне «Витебск. Место. Художник».

13–17 ліпеня ў Віцебску адбыўся XXVI Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», у якім удзельнічалі прадстаўнікі 36 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Форум прайшоў на высокім творчым і арганізацыйным узроўні. Па традыцыі адкрыў яго Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка і ўручыў спецыяльную ўзнагароду «Через искусство – к миру и взаимопониманию» народнай артыстцы Грузіі і Расіі Тамары Гвердцытэлі. У рамках фестывалю адбылося каля 120 мерапрыемстваў, у тым ліку канцэрты, тэатральныя пастаноўкі, выставы, конкурсы, перфомансы, кірмашы і інш. «Горад майстроў» быў прадстаўлены ў складзе падворкаў раёнаў Віцебшчыны і іншых абласцей Беларусі, каб паказаць усё багацце і шматграннасць мясцовых культур і традыцый. XIII Міжнародны фестываль творчасці інвалідаў праходзіў на працягу двух дзён, у яго праграму былі ўключаны выканальніцкія віды мастацтваў і мастацкая творчасць. Удзельнікамі III фестывалю вулічнага мастацтва «На сямі вятрах» сталі музыканты, лялечнікі, танцоры, паэты. Сёлета ўпершыню ў рамках «Славянскага

граматы, узнагароды, а таксама касцюмы для танца «Дружба народов». На адкрыцці прысутнічалі былыя ўдзельнікі калектыву. (*Жыццё Прыдзвіння. – 2017. – 15 жн. – С. 4.*)

Да 125-годдзя пачатку здраўнёўскіх сезонаў вялікага рускага мастака Ільі Рэпіна, якое адзначалася 5 жніўня, была прымеркавана фотовыстава віцебскага краязнаўцы Віктара Барысенкава «Здраўнёва і Віцебск» у музеі-сядзібе І. Я. Рэпіна «Здраўнёва».

У Талачынскім гісторыка-краязнаўчым музеі адбыўся семінар «Музей – партнёр у сістэме эколага-біялагічнай адукацыі і асветы насельніцтва» па рэалізацыі ініцыятывы «Экалагічная інтэрактыўная музейная прастора «Чалавек у прыродзе».

Экспазіцыя Полацкага краязнаўчага музея папоўнілася ўнікальным экспанатам. Гэта бронзавая сякера з закраінамі, якой каля 4 тысяч год.

У Пастаўскім раённым краязнаўчым музеі **ў жніўні** экспанаваўся твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі – сусветнавядомы Слуцкі пояс – сучасная копія, створаная Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Слуцкія паясы».

У Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры **ў жніўні** была разгорнута выстава «Ткацтва на Браслаўшчыне. Ад старажытнасці да сучаснасці». У экспазіцыі прадстаўлены археалагічныя знаходкі з Замкавай гары, кросны, інструменты для апрацоўкі льну, тканыя рэчы і інш. А яшчэ – узоры тканін і рэчы XX стагоддзя з фондаў музея, вытканыя браслаўскімі майстрыхамі. Асобнае месца адведзена работам сучасных ткачых, якія працавалі і працуюць ва ўстанове.

Прэзентацыя факсімільнага выдання ўнікальнага гістарычнага рукапісу 1270 года «Евангелие Лотыша» адбылася ў Полацкім музеі беларускага кнігадрукавання. У мерапрыемстве ўдзельнічаў мітрапаліт Рыжскі і ўсея Латвіі Аляксандр. (*Витебские вести. – 2017. – 19 авг. – С. 6.*)

У музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка **ў жніўні** адкрылася выстава «Колокольный мир Татьяны Кравченко» (з асабістай калекцыі сувенірных званочкаў жыхаркі Наваполацка).

пагаднення аб партнёрстве паміж Ушацкім раёнам і Тамашоўскім паветам у самых розных галінах супрацоўніцтва, у тым ліку ў культурнай сферы і турызме.

У пачатку ліпеня на Дубровеншчыне з сяброўскім візітам пабывала прадстаўнічая дэлегацыя з Татарстана: міністр культуры Татарстана Айрат Сібагатулін, ганаровы консул Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Татарстан Сяргей Марудэнка, старшыня міжнароднага грамадскага аб’яднання «Татара-башкірская спадчына Чышма» Эльвіра Ляўшэвіч, намеснік кіраўніка Мамадышскага муніцыпальнага раёна Айнур Аглямаў, прадстаўнікі навукі, культуры і краязнаўцы. **1 ліпеня** каля Дубровенскай ДШМ адбылося адкрыццё помніка татарскаму кампазітару Фарыду Яруліну, які аддаў жыццё за вызваленне Дубровеншчыны. У рамках візіту быў падпісаны дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Дубровенскім раёнам і Мамадышскім муніцыпальным раёнам. (*Дняпроўская праўда. – 2017. – 5 ліп. – С. 5.*)

15 ліпеня ў Шуміліне было падпісана пагадненне аб усебаковым супрацоўніцтве Шумілінскага раёна з Караноўскім раёнам Краснадарскага краю Расійскай Федэрацыі: у эканамічнай, гандлёвай галінах, сферы культуры, адукацыі, спорту і турызму. У складзе дэлегацыі з Кубані завітаў на шумілінскую зямлю і народны вакальны ансамбль «Дзядзькаўчаначка», які сабраў у раённым Цэнтры культуры поўную глядацкую залу. **18–22 жніўня** дэлегацыя Шумілінскага раёна прыняла ўдзел у святочных мерапрыемствах з нагоды 80-годдзя ўтварэння Краснадарскага краю, 225-годдзя асваення казакамі кубанскіх зямель, а таксама Дня Караноўскага краю. У станіцы Платніраўскай разгарнуўся фестываль нацыянальных культур «Вянок дружбы». Быў арганізаваны «Шумілінскі панадворак», майстры клуба «Спадчына» Дома рамёстваў дэманстравалі свае вырабы, народны фальклорны калектыў «Гульбічы» даў гадзінны канцэрт.

У сярэдзіне ліпеня было падпісана пагадненне паміж Віцебскім гарвыканкамам і муніцыпальным утварэннем горад-герой Валгаград

(Расія) аб супрацоўніцтве ў эканамічнай, навукова-тэхнічнай і сацыяльна-культурнай сферах.

У рамках V «Вішнёвага фестывалю» ў Глыбокім намеснік главы адміністрацыі горада Уварава Тамбоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі Валянціна Кабзар і першы намеснік старшыні Глыбоцкага райвыканкама Іосіф Пачкоўскі падпісалі пратакол намераў аб супрацоўніцтве паміж двума гарадамі. Фестываль фальклору і народных промыслаў «Вишневый сад» расіяне правялі 14 ліпеня ў сваім горадзе ў другі раз і прыехалі пазнаёміцца з беларускім фестывалем. Супрацоўніцтва вырашана пачаць з культурнага абмену.

22 ліпеня ў замкавым комплексе графаў Плятэраў у г. Краслава (Латвія) адбыўся фестываль кулінарнай спадчыны Латгальскага рэгіёна і Віцебскай вобласці. Імпрэза праводзілася ў рамках святкавання Дня горада. У час фестывалю адбыўся святочны канцэрт з удзелам творчых калектываў Верхнядзвінскага і Глыбоцкага раёнаў. (*Краязнаўчая газета. – 2017. – № 29 (жн.). – С. 1.*)

У канцы ліпеня прадстаўнікі Лёзненскага раёна пабывалі ў Веліжскім раёне Смаленскай вобласці і ў Дзямідаўскім раёне Маскоўскай вобласці. **22 ліпеня** яны прынялі ўдзел у святкаванні 481-й гадавіны з дня заснавання Веліжа і 90-годдзя Веліжскага раёна. **29 ліпеня** пабывалі на 15-ым Міжрэгіянальным фестывалі-кірмашы «Его Величество Огурец» у Дзямідаве. У выніку сустрэч вызначыліся новыя перспектыўныя накірункі дзейнасці, у тым ліку ў культуры.

Дэлегацыя Пастаўскага раёна **ў ліпені** прымала ўдзел у Днях Рэзэкненскага краю (Латвія). Паміж Пастаўскім райвыканкамам і Рэзэкненскай краявой думай існуе дамоўленасць аб супрацоўніцтве ў розных накірунках. Культуры адведзена асобнае месца, таму вялікія святы ў абодвух рэгіёнах праходзяць з удзелам самадзейных калектываў. Сёлета Пастаўшчыну прадстаўляў гурт «Званочкі» Варапаеўскай музычнай школы.

11 жніўня ў рамках двухбаковага супрацоўніцтва дэлегацыя

У Валынецкім краязнаўчым музеі імя І. Д. Чэрскага (Верхнядзвінскі раён) прайшла вечарына памяці «Апошняя экспедыцыя…» з нагоды 125-й гадавіны з дня смерці знакамітага земляка, вучонага, географа, геолага і палеантолага. Ураджэнец маёнтка Свольна Дрысенскага павета Іван Чэрскі прысвяціў сваё жыццё даследаванню Сібірскага краю.

«Прысутнасць Спірыдона» – пад такой назвай у Аршанскім музеі У. С. Караткевіча **на працягу ліпеня** экспанавалася выстава аршанскага мастака Сяргея Шарая. Галоўны герой экспазіцыі – кнігадрукар, асветнік, літаратар Спірыдон Собаль.

15 ліпеня ў г. п. Лёзна адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака на месцы разбуранай у 1962 годзе царквы Святога Узнясення Гасподня. Фундатарам выступіў ураджэнец Лёзненшчыны, цяпер грамадзянін Расіі, доктар тэхнічных навук Анатоль Бельчыкаў. У мерапрыемстве ўдзельнічалі старшыня Віцебскага аблвыканкама М. Шарснёў, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. Цярэнцьеў, афіцыйныя прадстаўнікі Руднянскага раёна Смаленскай вобласці.

У Клясціцах Расонскага раёна адзначылі 205-годдзе бітвы, якая адбылася 18–20 ліпеня 1812 года. У гонар генерал-лейтэнанта Пятра Вітгенштэйна, героя Айчыннай вайны 1812 года, на будынку мясцовай школы ўсталявана памятная дошка, якую стварылі краязнаўцы Андрэй і Аляксей Бухавецкія.

1 жніўня ў Віцебску была адкрыта памятная дошка з барэльефам генерал-маёра авіяцыі, Ганаровага грамадзяніна Віцебска Мікалая Фядотавіча Зайцава. Урачыстасць была прымеркавана да 100-годдзя з дня нараджэння былога камандзіра 3-й гвардзейскай ваенна-транспартнай авіяцыйнай дывізіі.

«В вихре танца» – выстава пад такой назвай адкрылася ў Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі. Яна прысвечана 55-годдзю прысваення танцавальнаму ансамблю «Колос» Віцебскага РДК звання народнага. У экспазіцыі прадстаўлены фатаграфіі, газетныя артыкулы,

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

23 ліпеня народная літаратурна-музычная гасцёўня «Крыніца» запрасіла ўдзельнікаў і гасцей на творчую сустрэчу, прысвечаную жыццю і творчасці выдатнага паэта-песенніка XX стагоддзя Роберта Раждзественскага.

23 жніўня ў чытальнай зале ЦРБ адбылася прэзентацыя кнігі пісьменніка, публіцыста, журналіста Мікалая Мароза «Не прасі палёгкі ў жыцця». Прыхільнікі беларускай літаратуры і творчасці земляка атрымалі асалоду ад сустрэчы з родным словам і аднадумцамі.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

3 ліпеня ля вёскі Новікі Віцебскага раёна адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяла загінуўшым і прапаўшым без вестак воінам 735-га самаходна-артылерыйскага палка 33-й арміі. На мітынг былі запрошаны ветэраны пошукавага руху Беларусі.

У Прыродна-экалагічным музеі Полацка на працягу **ліпеня-жніўня** экспанаваліся работы фіналістаў і пераможцаў Адкрытага нацыянальнага конкурсу фатаграфіі дзікай прыроды «Золотая рысь», у якім прынялі ўдзел прафесіяналы і аматары з Беларусі, Казахстана, Літвы, Расіі, Украіны, Ізраіля і іншых краін.

Калектыў музея-сядзібы Ільі Рэпіна «Здраўнёва» ўзнагароджаны спецыяльным дыпломам Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы «За творчае ўвасабленне ідэй дружбы народаў Беларусі і Расіі».

Міжнародная гільдыя майстроў у рамках супрацоўніцтва з Віцебскім абласным краязнаўчым музеем адкрыла ў Музеі прыватнага калекцыяніравання эксклюзіўную выставу «Невидальщина – маленькие чудеса в искусстве» **ў ліпені**. У экспазіцыі звыш 200 работ майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з 17 гарадоў Беларусі, Расіі, Украіны – разнастайныя жанры мініяцюрнай і мікрамініяцюрнай творчасці. **У жніўні** ў музейнай установе адкрылася выстава «Долары краін свету XIX–XX стагоддзяў» на аснове прыватнай калекцыі віцябляніна Леаніда Ялава.

Шаркаўшчынскага раёна прымала ўдзел у святкаванні 90-годдзя з дня ўтварэння Пскоўскага раёна Расійскай Федэрацыі. На свяце ў Цэнтры культуры і адпачынку вёскі Няёлава з поспехам выступіў эстрадны гурт «Рэзананс» Шаркаўшчынскага РЦК.

На святкаванне 840-годдзя латвійскага горада Лудза **11–13 жніўня** былі запрошаны творчыя калектывы Наваполацка – тэатр песні «Субботея» і ансамбль народнага танца «Прыдзвінскія россыпы». У святочным канцэрце з поспехам выступіў і народны ансамбль народнай песні «Заманіха» Полацкага раённага Цэнтра культуры.

У рамках святкавання 575-годдзя г. Сянно быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Сенненскім раёнам і Порхаўскім раёнам Пскоўскай вобласці. **26 жніўня** яго падпісалі старшыня Сенненскага райвыканкама Васіль Чараднік і в. а. главы адміністрацыі Порхаўскага раёна Валерый Усанёў.

Дэлегацыя Шаркаўшчынскага раёна наведала свята літоўскага горада Зарасай. Паміж Шаркаўшчынскім раёнам і Зарасайскім раённым самакіраваннем падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве, адной з мэт якога з'яўляецца падтрымка мясцовай культуры і захаванне гістарычнай спадчыны. Шаркаўчане пабывалі на фестывалі мастацтваў «Зарасай-2017».

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

16 ліпеня на базе Радзюкоўскага СДК Шаркаўшчынскага раёна адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні «Сябрына», у якім удзельнічалі паэты, пісьменнікі і музыканты Шаркаўшчынскага раёна, творчыя людзі з Міёр, Падсвілля, Браслава, Барысава. Нагодай стаў выхад чарговага зборніка вершаў шаркаўшчынскіх паэтаў «Пяе душа паэта, або Летнія фантазіі». Цудоўную музыку, танцы, песні дарылі прысутным удзельнікі народнага гурта «Купалінка» Каўшэлеўскага Дома фальклору.

У рамках фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» ў Мастацкім музеі Віцебска адбылася дэманстрацыя вяселля са старадаўнімі беларускімі традыцыямі. Ініцыятарам выступіў кітайскі мастак, выпускнік мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава Ян Лі Мін. Вясельны абрад для яго і нявесты Гао Лі Бін правялі загадчык аддзела фальклору і народных традыцый Лёзненскага РЦК Ганна Макравусава і фальклорны калектыў «Медуніца» аграгарадка Адаменкі.

25 ліпеня каля помніка У. С. Караткевічу ў аршанскім дзіцячым парку адбыліся традыцыйныя літаратурныя чытанні «І не знікаць паэтам вечна!» з удзелам народнага літаратурнага аб'яднання «Дняпроўскія галасы». У мерапрыемстве, прысвечаным Дню памяці Караткевіча, прынялі ўдзел супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі імя У. Караткевіча, цэнтральнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна, прыхільнікі творчасці слыннага земляка.

Прыгожа і змястоўна адзначылі ў в. Каханавічы Верхнядзвінскага раёна 200-годдзе з дня нараджэння знакамітага земляка, беларускага фалькларыста, паэта і грамадскага дзеяча Ігната Яўстахавіча Храпавіцкага. У зале мясцовага Дома культуры былі афармлены кніжная паліца з публікацыямі пра І. Храпавіцкага і выстава арыгінальных вырабаў сучаснага народнага мастацтва. Старшы навуковы супрацоўнік Верхнядзвінскага гісторыка-краязнаўчага музея А. Бубала расказаў пра жыццёвы і творчы шлях прагрэсіўнага каханавіцкага памешчыка. Перад прысутнымі выступілі мясцовыя паэты, гучалі песні ў выкананні народнага фальклорнага гурта «Сенькавіца». Адбылася прэзентацыя новай карціны мастака Валерыя Шчаснага «Успаміны аб Храпавіцкім. Рубон». (*Дзвінская праўда – 2017. – 4 жн. – С. 5.*)

Верхнядзвінскі раён першым у вобласці правёў абрад зажынак і пачаў уборку збожжа. Абрад першага снапа правялі самадзейныя артысты Сар'янскага СДК на чале з яго дырэктарам Аленай Мінчанка. Былі захаваны ўсе народныя звычаі – завязана «барада» з каласоў, засцелены абрус з хлебам, пастаўлены «сноп на сто коп».

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У ліпені ў дзіцячай бібліятэцы стартаваў юбілейны марафон «Не моўкне голас песняроў» да 135-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа. У рамках марафону з ліпеня па лістапад пройдзе шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных гэтай выдатнай юбілейнай даце. У ліпені бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў прыняць удзел у гучных чытаннях»І не знікаць іх вершам вечна».

У жніўні ў ЦРБ імя Е. Лось для дзяцей са школьнага лагера было арганізавана слайд-падарожжа «Просвещение через книгу» (да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання). Вялікадолецкая бібліятэка запрасіла чытачоў на інфармацыйную гадзіну «Мода – зеркало истории», прымеркаваную да Міжнароднага дня моладзі.

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Альшанская сельская бібліятэка **ў ліпені** арганізавала да Года навукі дэкаду «Навука без нуды». Чытачам былі прапанаваны мерапрыемствы: прагляд пазнавальных мультфільмаў, гульні-віктарыны «Навуковыя адкрыцці і вынаходствы», школа навуковых даследаванняў «Займальныя досведы» і інш.

ДУК «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

2 ліпеня бібліятэкары райцэнтра прынялі ўдзел у раённым фестывалі «Прыдзісненскія крыніцы». У «Бібліядвары» жадаючыя знаёміліся з кніжнай выставай «Ад Скарыны да нашых дзён», дзе была прастаўлена літаратурная спадчына першадрукара і творчасць сучаснікаў – шаркаўшчынскіх паэтаў і пісьменнікаў. На выставе «Кніга сваімі рукамі» былі размешчаны самаробныя кнігі, створаныя бібліятэкарамі ЦБС.

У Германавіцкай бібліятэцы **ў жніўні** да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання была афармлена кніжная выстава «І вечным застанецца слова» і праведзена пазнавальная гадзіна «Помнікі беларускага пісьменства».

5 жніўня работнікі ЦРБ правялі экскурс у гісторыю «Прайшло слова праз стагоддзі», прысвечаны 500-годдзю з дня першадрукавання беларускай кнігі «Псалтыр». Мерапрыемства сабрала моладзь, прадстаўнікоў культуры і адукацыі горада**. 23 жніўня** ў цэнтральнай бібліятэцы была праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя «Беларусь – мая маці і мова, паветра і хлеб» (да 100-годдзя з дня нараджэння Пімена Панчанкі).

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Ва ўстановах Сенненскай ЦБС **у ліпені** адзначылі 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы. Галоўнае мерапрыемства прайшло ў в. Беліца. У 1903–1904 гадах малады Янка Купала (Іван Луцэвіч) служыў у маёнтку Свяцкіх, які размяшчаўся на тэрыторыі сучаснага аграгарадка Полымя. Супрацоўнікі ЦРБ правялі тут паэтычны фэст-падарожжа «Паклон прымі, Пясняр!». У дзіцячай бібліятэцы была праведзена літаратурная віктарына «Янка Купала – дзецям», у Машканскай бібліятэцы прайшла літаратурная гадзіна «І не змоўкнуць ніколі Купалавы словы».

3 жніўня ў ЦРБ адбылася творчая сустрэча з расійскім паэтам Мікалаем Траццяковым пад назвай «С любовью к родной Беларуси». Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава «Эхо стихов Николая Третьякова».

На працягу **жніўня** быў рэалізаваны шэраг мерапрыемстваў праекта цэнтральнай і дзіцячай бібліятэк «Библиотека под открытым небом. Книга под солнцем». Работнікі ЦРБ арганізавалі бібліятэчны дворык «С книгой на скамейке», правялі кнігападарожжа «Там, на неведомых дорожках». У ДРБ былі праведзены забаўляльна-пазнавальная гадзіна «Расти сильным и здоровым», летнія прыгоды «Книжкин кинозал», экалагічная гульня-падарожжа «Давайте с природой дружить».

Каб падтрымаць у гарачы час удзельнікаў жніва, натхніць работнікаў палёў на слаўную працу, агітбрыгады работнікаў культуры Віцебшчыны па традыцыі выязджалі на поле да хлебаробаў з канцэртамі.

12 жніўня ў аграгарадку Мазалава Віцебскага раёна работнікі мясцовых устаноў культуры і жыхары ўпершыню ладзілі свята калодзежа, які вядомы як Шульцаў. На свяце вяскоўцы спявалі і танцавалі, спрабавалі гаючую ваду, успаміналі казкі і паданні пра студні. Добры настрой дарылі народны жаночы клуб «Залаты ўзрост» і тэатральны гурток «Вобраз». Сельскія бібліятэкары аформілі выставу літаратуры «Жыве плынь крыніц крыштальных».

У жніўні ў літаратурна-этнаграфічнай гасцёўні «Скарб», створанай пры Багатырскай бібліятэцы Полацкага раёна, адбылася прэзентацыя выстаўкі малюнкаў «Вандроўка па родным краі» Людмілы Гержот з г. п. Ветрына. Мерапрыемства было арганізавана сумесна з клубам «Майстар» Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур і аўтаклубам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Полацкага райвыканкама. Таксама ў мерапрыемстве прыняў удзел калектыў мастацкай самадзейнасці Багатырскага СДК і вакальная група ветэранаў «Радуга» з Ветрына.

26 жніўня ў аграгарадку Альгова Віцебскага раёна адбылося свята вёскі. Яго ўпрыгожвалі выставы гародніны «Падзівіцеся, пахваліцеся», экспазіцыя ганчарных вырабаў, конкурс букетаў, кніжная выстава **«З любоўю да зямлі і людзей»** і інш. Вялікую цікавасць вызвала **бібліятэчная выстава-банер «Вёскі Альгова і Падбярэззе ў беларускім алфавіце»**, на якой былі прадстаўлены фотаздымкі з жыцця вёскі. Загадчык Альгоўскай сельскай бібліятэкі Алена Сергіенка паведаміла шмат цікавых звестак пра гістарычнае мінулае свайго роднага краю і яго славутых землякоў. Работнікі мясцовага Дома культуры падрыхтавалі насычаную канцэртную праграму.

КЛУБНАЯ СПРАВА

Першы пісьмовы ўспамін пра вёску Пліса Глыбоцкага раёна датуецца 7 ліпеня 1507 г. З нагоды юбілейнай даты было праведзена свята вёскі, на якое завіталі прадстаўнікі раённай улады і раённых службаў. Прайшло ўшанаванне і ўзнагароджанне жыхароў вёскі, якія вызначыліся ў розных сферах дзейнасці. Свой талент дарылі вяскоўцам акцёры народнага тэатра фальклору «Цярэшка», самадзейныя артысты Гатаўшчынскага і Прошкаўскага СДК. 9 ліпеня адбылося свята аграгарадка Абруб гэтага ж раёна. Ушаноўвалі ветэранаў працы, доўгажыхароў, лепшых працаўнікоў. Музычныя падарункі вяскоўцам дарылі салісты студыі «Архіў» Глыбоцкага ГДК. Працягам добрай традыцыі стала свята аграгарадка Галубічы – самай старэйшай вёскі раёна, якой споўнілася 586 гадоў. Канцэрт «Дом, у якім жыве свята» быў падрыхтаваны работнікамі Галубіцкага і Азярэцкага Цэнтраў культуры, аўтаклубам Глыбоцкай цэнтральнай клубнай сістэмы. З віншаваннямі, кветкамі, песнямі прайшло свята вёскі Гатаўшчына, падрыхтаванае работнікамі мясцовага СДК і самадзейнымі артыстамі.

7 ліпеня было праведзена свята вёскі Чубакова Дубровенскага раёна з нагоды 410-годдзя населенага пункта. Музычную частку свята падрыхтаваў вакальны гурт «Сяляначка» Станіславоўскага СДК.

На Сенненшчыне таксама стала традыцыяй ладзіць летам святы вёсак. **У ліпені** гасцей з райцэнтра гасцінна сустракалі жыхары вёсак Расна і Буй. Перад вяскоўцамі выступіў народны ансамбль «Вясёлыя музыкі».

15 ліпеня ў Высокагарадзецкім сельскім клубе Талачынскага раёна адбыліся свята вёскі і вечар адпачынку пад назвай «Мілы сэрцу куток», падрыхтаваныя загадчыцай клуба Алёнай Хрол і ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці.

22 ліпеня прайшло свята вёскі Прылессе Талачынскага раёна. Музычнае і песеннае суправаджэнне, звесткі з мінулага і сённяшняга дня вёскі падрыхтавалі работнікі раённага аўтаклуба і група «Вандруючыя

ДУК «Міёрская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У Міёрскай дзіцячай бібліятэцы **ў жніўні** экспанавалася выстава «Войны не знаю, но помню о ней», падрыхтаваная сумесна з Міёрскім гісторыка-этнаграфічным музеем. Былі прадстаўлены музейныя экспанаты часоў Вялікай Айчыннай вайны і літаратура па тэме. Упершыню на плошчы Памяці загінуўшых барацьбітоў у райцэнтры было праведзена мерапрыемства «Уличный хит-парад лучшей книги детства».

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

8 ліпеня на пляцоўцы ля памятнага знака «Геаграфічны цэнтр Еўропы» працавала «Маладзежная пляцоўка ЎКантакце». Бібліятэкары арганізавалі буккросінг і афармілі выставу «Бібліятэрапія – лячэнне кнігай».

У жніўні ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога прайшоў Дзень ведаў і адкрыццяў «Хачу ўсё ведаць» (да Года навукі), была праведзена пазнавальна-гульнёвая праграма «Сонечны астравок дзяцінства».

17 жніўня дзіцячы аддзел бібліятэкі імя Я. Купалы запрасіў юных чытачоў на гістарычную гадзіну «Ты жывеш у Беларусі».

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

7 ліпеня ў Пастаўскай ЦРБ была праведзена літаратурна-музычная віктарына «У вянку квяцістым купалаўскага слова», прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы. Прысутнічалі аматары паэтычнага слова, паэты Пастаўшчыны, чытачы розных пакаленняў.

18 ліпеня ў Парыжскай сельскай бібліятэцы было арганізавана падарожжа ў даўніну «Гулкія крокі стагоддзяў». Прысутнічалі ўдзельнікі аматарскага аб’яднання «Парыжанка», пастаянныя чытачы, настаўнікі гісторыі і інш. У аснову мерапрыемства лёг той факт, што Напалеон калісьці пабываў у гэтых мясцінах і яго выраз «Прыгожа, як у Парыжы!» стаў усім вядомы.

бібліятэкары ў сваю чаргу падзяліліся вопытам работы. Прадоўжыўся семінар на базе Прудніцкай сельскай бібліятэкі, дзе было праведзена краязнаўчае падарожжа «Крочым па родным краі».

4 жніўня супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі для сваіх чытачоў арганізавалі **інтэрактыўную літаратурную сустрэчу** «Свет далёкай зоркі». Наведвальнікі бібліятэкі пазнаёміліся з творчасцю Янкі Брыля пры дапамозе відэафільма і кніжнай выставы «Пішу як жыву».

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Работнікі Арловіцкай сельскай бібліятэкі-клуба правялі **6 ліпеня** тэатралізаванае прадстаўленне «Каля дняпроўскіх вод зноў купальскі карагод», а **25 жніўня** арганізавалі свята вёскі Арловічы «Здесь край мой, исток мой, дорога моя».

15 жніўня Асінторфская бібліятэка правяла для сваіх чытачоў мядовыя пасядзелкі «НеобыЧайная церемония».

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

На працягу жніўня ў ЦРБ праводзілася краязнаўчая віктарына «Я ў гэтым горадзе жыву, я гэты горад ведаю», дзіцячая бібліятэка арганізоўвала чытанні «Про всех и всё на свете расскажут книги эти» ў гарадскім парку. У сельскіх бібліятэках праходзіў цыкл мерапрыемстваў у рамках праграмы летніх чытанняў «Летний остров в океане книг».

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

19 жніўня Стасеўская сельская бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на асветніцкую гадзіну «Першадрукар. Мысліцель. Гуманіст», прысвечаную 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

20 жніўня ў Барсееўскай сельскай бібліятэцы прайшло мерапрыемства, прысвечанае 85-годдзю з дня нараджэння паэта Р. Раждзественскага.

артысты», а раённы Дом рамёстваў разгарнуў шырокі паказ-продаж сваіх вырабаў.

Супрацоўнікі раённага цэнтра народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці Дубровенскага раёна праводзілі летам традыцыйныя брэндавыя святы. У аграгарадку Ляхаўка ў трэці раз прайшло свята бліноў. У правядзенні свята былі задзейнічаны ўдзельніцы клуба нацыянальнай кухні і беларускай гульні «Дубровенскія прысмакі», вакальная група «Сияние» Дубровенскага РДК і інш. Калінаўскі СДК Дубровенскага раёна правёў «Свята вышыванкі». Культработнікі арганізавалі на пляцоўцы каля СДК выставу вышытых вырабаў мясцовых майстрых. Канцэртныя нумары падрыхтавалі ансамбль «Калінаўскія маладзіцы» і дзіцячы ансамбль «Глыбінка». На свята прыехалі ансамблі «Надзея» (Сваташыцы), «Кудзеліца» (Дуброўна), «Сяляначка» (Станіславова). Ансамбль «Беларусачка» з Асінторфа прадэманстраваў канцэртную вопратку, якую кожная ўдзельніца вышывала для сябе сама. (*Дняпроўская праўда. – 2017. – 2 жн. – С. 5.*)

Работнікі Ляднянскага СДК Дубровенскага раёна падрыхтавалі для жыхароў вёскі Ляды «Ляднянскі кірмаш» з мэтай адраджэння былой мясцовай традыцыі. Працавалі гандлёвыя рады, праходзілі конкурсы. У свяце ўдзельнічалі майстры Дома рамёстваў, члены аматарскага аб’яднання «Травница» Дубровенскага РДК, творчыя калектывы раёна.

4 жніўня пад назвай «Жыве родная вёска!» было арганізавана свята вёскі Кабішча Гарадоцкага раёна. Мясцовыя культработнікі аформілі выставу народнай творчасці, размясцілі стэнд «Самыя прыгожыя дамы вёскі». Сваімі песнямі радавала вяскоўцаў вакальная група «Натхненне».

12 жніўня ў аграгарадку Сваташыцы Дубровенскага раёна прайшоў фінал праекта аграфэст, прымеркаваны да 410-годдзя вёскі. Ушаноўвалі старажылаў, юбіляраў, маленькіх жыхароў. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці раённага Дома культуры падрыхтавалі

святочную шоу-праграму.

У жніўні ў аграгарадку Германавічы Шаркаўшчынскага раёна было праведена ў трэці раз цікавае і самабытнае свята «Бульбяны фэст». Гучалі песні, вершы, прыпеўкі, ладзіліся гульні і танцы, з гледачамі была праведзена віктарына пра «другі» хлеб беларусаў. На свяце прысутнічалі ўдзельнікі народнага літаратурна-музычнага аб'яднання «Світанак», аб'яднанняў «Стараверскія страпухі», «Калядзіца», госці з райцэнтра, Браслава, Глыбокага і Мінска.

Работнікі Васюкоўскага СДК Шаркаўшчынскага раёна правялі **ў жніўні** свята землякоў у вёсцы Курылавічы. На свята завітала не толькі мясцовае насельніцтва, але і ўраджэнцы вёскі, якія пражываюць за межамі раёна і ў блізкім замежжы. Святочны настрой дарылі кожнаму прысутнаму вакальны гурт «Каліна» і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці СДК.

На традыцыйным Дні аграгарадка ў Крынках Лёзненскага раёна адбылося ўрачыстае адкрыццё абноўленай Дошкі гонару сельскага Савета, была праведзена гульнёвая праграма-конкурс «Гаспадыня аграгарадка».

Капцянскі СДК Віцебскага раёна святкуе ў гэтым годзе 40-годдзе з дня заснавання. Да юбілею мясцовыя культработнікі прымеркавалі праект «Дом, у якім жыве творчасць». Пачаткам стала свята двара Таццяны Долгай – актыўнай удзельніцы мастацкай самадзейнасці на працягу многіх гадоў, а зараз члена клуба аматараў песні «Созвездие» сельскага Дома культуры.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

2 ліпеня ў філіяле Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў Ляўках Аршанскага раёна адбылося раённае свята «Купала заўсёды ў сэрцы маім», прысвечанае 135-годдзю з дня нараджэння паэта. На свята прыехалі музейныя работнікі, віцебскія і мінскія літаратары. На пляцоўцы майстар-класаў госці ўбачылі творчыя набыткі майстроў Аршанскага Дома рамёстваў, ля помніка паэту прагледзелі ўрывак са спектакля «І смех

абслугоўвання раённай бібліятэкі паралельна праводзілі вулічную акцыю «Гартайце, чытайце, свет пазнавайце». Чытачы маглі пазнаёміцца з новай перыёдыкай і кнігамі.

16 жніўня ў дзіцячай бібліятэцы была праведзена літаратурна-гульнёвая праграма «Казачны горад дзяцінства».

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

4 ліпеня Суражская гарпасялковая бібліятэка сумесна з Шапуроўскай сельскай бібліятэкай правялі вечар-успамін «Кругі зямныя Барыса Беляжэнкі» (да 80-годдзя з дня нараджэння паэта і празаіка, земляка, Ганаровага члена Саюза пісьменнікаў Беларусі). Да мерапрыемства ладзілася кніжная выстава «Поет душа поэта».

25 ліпеня ў Акцябрскай бібліятэцы прайшла творчая сустрэча пад назвай «Шакулаўскія чытанні». З юнымі чытачамі сустрэліся Ніна і Андрэй Ільіны – дачка і ўнук вядомага дзіцячага пісьменніка Рыгора Шакулава. Мерапрыемства было прымеркавана да 107-й гадавіны з дня нараджэння пісьменніка-земляка.

Удзельнікі праекта «Нестандартная бібліятэка» (Альгоўская с/б) падхапілі ініцыятыву сваіх сучаснікаў з г. Ліды і арганізавалі пры бібліятэцы валанцёрскі рух «Я чытаю маленькім». Гучныя чытанні валанцёры праводзяць як у бібліятэцы, так і ў дзіцячым садку. Для ўдзельнікаў праекта ў бібліятэцы афармлены інфармацыйны куток «Лофт для тинейджера», праведзена бліц-апытанне «Я иду в библиотеку, чтобы…».

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

19 ліпеня адбыўся тэматычны семінар «Сельская бібліятэка як частка сацыяльнай структуры вёскі і грамадскага жыцця мясцовасці». Пачаўся семінар у Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэцы, дзе бібліятэкар чытальнай залы правяла кансультацыю для сельскіх бібліятэкараў «Бібліятэка: краязнаўства – прыарытэтны накірунак дзейнасці», а

бібліятэцы імя У. Караткевіча прайшоў Купалаўскі тыдзень «Шматгалоссе роднай зямлі», на працягу якога дзейнічалі выставы «Знакаміты пясняр Беларусі» і «Мая любімая кніга Купалы», наведвальнікі бібліятэкі прымалі ўдзел у віктарыне і гучных чытаннях твораў юбіляра.

У бібліятэцы імя Я. Коласа працягвала работу фотавыстава «Спасибо за жизнь». У яе рамках адбыўся літаратурна-асветніцкі вечар. Прадстаўнікі каардынацыйнага цэнтра абароны жыцця і сямейных каштоўнасцяў «Зарождение» Полацкай епархіі распавялі пра ідэю выставы і прапанавалі гасцям паразважаць на тэму ўмацавання сям'і.

4 жніўня ў бібліятэцы імя К. Сіманава адбыўся вечар памяці «Сердце матери», прысвечаны дню памяці воінаў, якія загінулі ў мірны час. У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшыня Камітэта салдацкіх маці І. Протас і намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гарвыканкама К. Вайшнаровіч.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

5 ліпеня ў ЦРБ быў праведзены Дзень Янкі Купалы «Душой і сэрцам служыў Беларусі». У праграме: акцыя «Чытаем Купалу разам!», літаратурная кампазіцыя «Паэт з беларускіх узгоркаў сініх».

6 ліпеня работнікі дзіцячай бібліятэкі правялі літаратурна-музычную кампазіцыю «Гонар зямлі беларускай: Янка Купала і Якуб Колас».

17 жніўня ў ЦРБ была праведзена нарада бібліятэчных работнікаў раёна «Дзень прафесійных зносін», у рамках якой адбыўся бібліятэчны практыкум «Інавацыйныя формы работы бібліятэк з беларускай кнігай у рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання».

ДУК «*Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна*»

У ліпені прадоўжыў работу літаратурны праект па набліжэнні кнігі да чытача. Дзіцячая бібліятэка ў рамках праекта праводзіла акцыю «С книжкой на скамейке». Наведвальнікаў чакалі незвычайныя сустрэчы з кнігай, казачная латарэя, гульні, прызы. Супрацоўнікі аддзела

і грэх». Песні на вершы Янкі Купалы гучалі ў выкананні беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры».

3 ліпеня ў рамках святкавання Дня Незалежнасці Беларусі ў г. п. Лёзна былі праведзены раённае свята-конкурс музыкі і песні «Граюць музыкі» і раённы турнір беларускіх побытавых танцаў «Танцуй, не лянуйся!». На працягу некалькіх гадзін у парку панавалі баян, гармонік і народныя напевы, бо ў райцэнтр прыехалі самадзейныя артысты з усіх Дамоў культуры аграгарадкоў. У танцавальным турніры прынялі ўдзел 23 пары, у тым ліку дзеці, з усіх устаноў культуры раёна.

Народнае свята **Купалле** на засталося без увагі работнікаў культуры Віцебшчыны. Сапраўднае тэатралізаванае прадстаўленне з захаваннем галоўнай асаблівасці купальскай ночы – распальваннем вогнішча і пошукам папараць-кветкі – было падрыхтавана супрацоўнікамі Сенненскага Цэнтра культуры і народнай творчасці. Спецыяльна для дзятвы была наладжана гульнёвая праграма, якую правялі супрацоўнікі РЦДіМ і ЦБС. Культработнікі Лепельшчыны правялі свята Купалля на беразе возера Святое. Дзейнічаў «Гульнёвы панадворак» Стайскага СДК, прайшоў раённы конкурс «Міс Купалінка» сярод сельскіх клубных устаноў. Тэатралізаванае прадстаўленне «Ноч на Яна» народнага фальклорнага клуба «Кругаверць» адкрыла канцэртную праграму творчых калектываў раёна. Купальскае свята ў Браславе праходзіла на Замкавай гары. Яно ўключала кірмаш рамёстваў «Браслаўскі вянок», гульнёвыя і забаўляльна-танцавальныя праграмы, сольны праект «Полацк – маладзёжная сталіца-2017» народнай студыі эстраднага мастацтва «Тандэм» Полацкага раённага Цэнтра культуры. У Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна» за ўвесь час яго работы народнае свята Купалле правялі ўпершыню. Рэжысёр-пастаноўшчык і кіраўнік ансамбля «Жалейка» Марына Самоліна, мастацтвазнаўца, вучаніца вядомага этнографа і фалькларыста Івана Крука, кіравалася традыцыямі, але і ўключыла некаторыя новыя звычаі.

У рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў «**Славянскі**

базар у Віцебску» адбылося шмат конкурсаў. Віцебскі АМЦНТ арганізаваў для таленавітых школьнікаў і творчай моладзі свята-конкурс тэатраў моды «Модны дывертысмент». Творчыя калектывы дэманстравалі падрыхтаваныя калекцыі і ўменне дэфіліраваць на сцэне ў намінацыях «Спадчына», «Сучаснасць», «Віват, фестываль!», «Дагары нагамі». Упершыню на фестывалі адбыўся турнір бытавых танцаў з удзелам каля 70 танцавальных пар з усіх рэгіёнаў Віцебшчыны. 15-17 ліпеня прайшоў конкурс майстэрства культарганізатараў «Пачынай з зарадкі кожны дзень». Гран-пры свята-конкурсу атрымаў творчы калектыў УК «Полацкі раённы Цэнтр культуры» за гульнёвую праграму «Здаровы weekend па-Полацку» (аўтары Ірына Крыванос і Аляксей Зуеў).

Раённае свята «Арнаменты роднага краю» правялі работнікі культуры Дубровеншчыны. Звыш 30 нацыянальных касцюмаў з традыцыйнай дубровенскай вышыўкай і каларытных рушнікоў былі прадстаўлены на выставе ў райцэнтры. Апафеозам свята стаў першы раённы турнір бытавога танца з удзелам 15 пар. Перамаглі ў танцавальным спаборніцтве прадстаўнікі Асінторфскага СДК.

18–22 ліпеня ў Глыбокім у 5-раз прайшоў «Вішнёвы фестываль», якому ў гэтым годзе прысвоены статус міжнароднага. У фестывальнай праграме – конкурсы, канцэрты, творчыя сустрэчы. Працавалі тэматычныя пляцоўкі, выстава работ народных майстроў «Вішнёвы кірмаш», праходзілі дабрачынныя акцыі. На гарадскім стадыёне адбыўся Дзень спорту «Алімпійская вішня-2017». На Дні Моладзі «Вішнёвая феерыя» былі арганізаваны аўта-шоу «Вішнёвы заезд», конкурс «Міс Лета-2017», гала-канцэрт маладых выканаўцаў з паказам маладзёжнай моды «Вішнёвы стыль». У рамках фестывалю адбылося адкрыццё дэкаратыўна-мастацкай кампазіцыі «Дружба народаў» на Цэнтральнай плошчы. На свяце прысутнічалі афіцыйныя дэлегацыі з Расіі, Германіі, Францыі, Польшчы, Ізраіля, Латвіі, Літвы, Грузіі. Асобны каларыт святу надалі выступленні калектыву «Узор'е» з расійскага горада Шлісельбурга, дзіцячага хору «ВіланЭла» з ізраільскага горада Кір'ят-Бялік, ансамбля «Аколіца»

члена Беларускага саюза мастакоў Алега Крошкіна «Магія колеру». У экспазіцыі прадстаўлена 12 работ, выкананых акрылавымі фарбамі.

20 ліпеня ў Віцебскім абласным упраўленні Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь прайшоў адзіны дзень інфармацыі, у рамках якога супрацоўнікі бібліятэкі расказалі пра асаблівасці сваёй працы і прадставілі прэзентацыю «Витебская областная библиотека: история и современность». Удзельнікі мерапрыемства змаглі пазнаёміцца з кніжнай выставай «На службе Закона, Народа, Отечества».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

6 ліпеня ЦГБ імя М. Горкага прымала ў сябе дэлегацыю бібліятэкараў Відземскага культурна-гістарычнага раёна Латвіі – з гарадоў Цэсіс, Амата і Лігатне. Дырэктар ЦБС Галіна Данілава пазнаёміла гасцей з бібліятэкай, а потым прапанавала мультымедыйную прэзентацыю «Сацыяльная эфектыўнасць дзейнасці бібліятэк», дзе былі прадстаўлены найбольш цікавыя і значныя праекты, мэтавыя праграмы, акцыі і работа па грантах. Латвійскіх калег зацікавіла выстава самаробных кніг, падрыхтаваных да ўдзелу ў абласным конкурсе, прысвечаным 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Потым госці расказалі пра сябе і выказалі бібліятэцы імя М. Горкага падзяку за цёплую сустрэчу.

У жніўні ў бібліятэцы імя Я. Маўра былі праведзены: літаратурна-пазнавальная гадзіна «Царства ведаў, таямніц, адкрыццяў», літаратурнае падарожжа «Кніжны смак лета».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

1 ліпеня супрацоўнікі ЦБ імя У. Маякоўскага ў складзе дэлегацыі работнікаў культурных устаноў горада прымалі ўдзел у святкаванні Дня горада Бабруйска, дзе прадставілі краязнаўчую экспазіцыю «Город молодости».

У дні святкавання 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы ў

20 жніўня Лепель ў чацвёрты раз вітаў удзельнікаў Міжнароднага міфалагічнага фестывалю «У госці да Лепельскага Цмока». У гарадскім парку гасцей сустракалі «Музычны алімп», «Дзіцячы пагорак», «Даліна рамёстваў», «Танцавальная лагчына», «Кулінарны востраў», «Турыстычнае ўзбярэжжа». У канцэртнай праграме выступілі беларускія гурты «Палац», «Малала», «Варган» і інш., а таксама ўкраінскі гурт «TaRuta». У «Магічным яры» ўсе жадаючыя запускалі паветраных змеяў – маленькіх цмокаў.

26 жніўня ў г п. Арэхаўск Аршанскага раёна адбылося свята «Арэхавыя пацехі», якое арганізавалі супрацоўнікі Аршанскага раённага Дома культуры. На брэндавае мерапрыемства, якое праводзіцца ўжо некалькі гадоў, з'ехаліся шматлікія госці з Оршы, Лёзна, Талачына, Дуброўна і суседняга Смаленска. У праграме: інтэрактыўныя гульні, выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Ореховые штучки», конкурс «Ореховое изобилие», тэматычная дыскатэка Nuts&Dancing і інш.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

5 ліпеня ў Смаленскім дзяржаўным універсітэце адбыўся міжнародны круглы стол «Беларускія смаляне, смаленскія беларусы»: пра ролю карпаратыўных праектаў у вывучэнні гісторыі расійска-беларускага памежжа». З дакладам аб рабоце Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна ў рамках праекта выступіла вядучы бібліёграф аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Кацярына Яскевіч.

14 ліпеня ў бібліятэцы ў рамках XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» адбыўся канцэрт двух творчых калектываў з Латвіі – вакальнага ансамбля «Рябинушка» Цэнтра культуры Прэйльскага краю славянскага таварыства «Радуга» Саюза беларусаў Латвіі і ансамбля народнага танца «Ассорти» Прэйльскай сярэдняй школы № 2.

20 ліпеня ў бібліятэцы адбылося адкрыццё персанальнай выставы

Дагдскага беларускага грамадства «Вербніца» (Латвія), ансамбля танца «Сударушкі» (Эстонія), калектываў з Польшчы і Літвы. У традыцыйным конкурсе баяністаў «Вішнёвыя найгрышы» прынялі ўдзел музыканты з розных краін. Гран-пры атрымала выкладчык Глыбоцкай ДШМ Таццяна Кузьміч. Глыбачан і гасцей свята парадавалі гала-канцэрт «Вішнёвае суквецце сяброўства», канцэртная праграма «Вішнёвая нота-2017», аўкцыён «Вішнёвы пірог» і яркі салют. (*Витебские вести. – 2017. – 25 июля. – С. 1, 8.* ; *Веснік Глыбоччыны. – 2017. – 26 ліп. – С. 4–5.*)

21–23 ліпеня адбыўся пяты міжнародны спартыўна-музычны фестываль «Viva Braslav». На гарадскім цэнтральным пляжы возера Дрывяты сабралася каля 20 тысяч чалавек – аматараў сучаснай музыкі і актыўнага адпачынку з усёй Беларусі і бліжэйшых краін. Праводзіліся спартыўныя спаборніцтвы, адбыўся фінал конкурсу «Міс Viva Braslav-2017», прайшлі канцэртныя праграмы і начная дыскатэка.

Аматараў лясной ягады сабраў **22 ліпеня** сёмы экафестываль «Полацкая чарніца-2017». Арганізатары мерапрыемства падрыхтавалі насычаную культурна-забаўляльную праграму, у рамках якой прайшлі выступленні творчых калектываў Полацкага раёна, выставы, першы рэгіянальны конкурс прыгажосці і творчасці «Міс Полацкая чарнічка-2017». На праспекце Скарыны працавала выстава-кірмаш дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Горад майстроў». Супрацоўнікі Полацкай РЦБС і Прыродна-экалагічнага музея падрыхтавалі свае праграмы па тэме свята.

29 ліпеня на Полаччыне прайшоў 5-ы традыцыйны фестываль «Milk-Land – 2017». Сталіцай малочнага фестывалю ў чарговы раз стаў аграгарадок Блізніца, дзе адбылося ўшанаванне працаўнікоў малочнай галіны. Культработнікі падрыхтавалі вялікую святочную праграму. У фае Сільніцкага СДК майстрыхі Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур адкрылі «Малочную майстэрню» па вырабе сувеніраў. На сцэне СДК артысты Полацкага раённага Цэнтра культуры прадставілі тэатралізаваную кампазіцыю «Сіла малака». У канцэртнай праграме выступілі творчыя калектывы культасветустаноў раёна.

Упершыню прагучаў гімн свята, які напісаў і выканаў мастацкі кіраўнік Сільніцкага СДК Уладзімір Піскуноў.

9–13 жніўня ў вёсцы Белая Царква Чашніцкага раёна прайшоў першы міжнародны фестываль узаемадзеяння з гістарычным і прыродным ладшафтам сродкамі сучаснага мастацтва, рамёстваў і музыкі «SPRAVA». Задача праекта – стварыць унікальную культурную прастору: музейныя пляцоўкі і экспазіцыі пад адкрытым небам, адукацыйныя міні-цэнтры, творчыя рэзідэнцыі. Мясцовыя ўлады падтрымалі гэтую ідэю сталічных творцаў, плануецца зрабіць фестываль музыкі, мастацтва, ёгі і простай вясковай ежы традыцыйным. (*Чырвоны прамень – 2017. – 15 жн. – С. 2. ; Витебские вести. – 2017. – 17 авг. – С. 23.*)

13 жніўня ў Глыбокім у другі раз было праведзена раённае свята «Мядовы Спас». У праграме: тэатралізаванае прадстаўленне «Мядовы Спас», канцэртная праграма «Мядовая карусель», выстава-кірмаш вырабаў народных майстроў і рамеснікаў, флешмоб «З кнігай па жыцці», прымеркаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, гульні, конкурсы, акцыі. Спевамі і танцамі радавалі творчыя калектывы і выканаўцы Глыбоччыны , а таксама госці свята – фальклорны калектыў з латвійскага горада Салдус.

19 жніўня ў в. Алашкі Шаркаўшчынскага раёна адбыўся 19-ы фестываль «Яблычны Спас». Сёлетняе рэгіянальнае свята прайшло з асаблівым размахам. Удзельнічалі міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў і яго намеснік Васіль Чэрнік, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Ларыса Аленская, генеральны консул генеральнага консульства пасольства Рэспублікі Беларусь у Латвіі Уладзімір Клімаў, консул Латвіі ў г. Віцебску Угіс Скуя, прадстаўнікі Даўгаўпілскай і Екабпілскай краявых дум і кіраўніцтва гарадоў Айзкраўкле, Зілупэ (Латвія), госці з Пскоўскага раёна (Расія). Удзельнікам свята была прапанавана насычаная праграма, якая праходзіла на шматлікіх

інтэрактыўных пляцоўках. У рамках фестывалю адбыліся фінал раённага конкурсу «Уладар сяла», стылізаванае «Яблычнае вяселле», яблычны флешмоб і інш. Працавала літаратурная гасцёўня, выступалі мясцовыя самадзейныя артысты і творчыя калектывы з Латвіі і Расіі.

19 жніўня прайшоў экафэст «Яблычны Спас у Полацку-2017». У Свята-Пакроўскім храме адбыўся святочны малебен, былі асвечаны яблыкі, а каля царквы працавалі пляцоўкі «Яблычнае раздолле», «Садовы лікбез» і інш. На пляцоўцы «Яблычнае мастацтва» можна было ўбачыць, як ствараюць карціны з яблыкаў, прысвечаныя 1155-годдзю Полацка, 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і Дню беларускага пісьменства.

19 жніўня ў аграгарадку Бачэйкава Бешанковіцкага раёна прайшоў першы фестываль духоўнай творчасці і культуры «Жнівеньскія Спасы», прысвечаны жнівеньскім праваслаўным святам – Яблычнаму, Мядоваму і Арэхаваму Спасам. У рамках свята адбыліся: тэатралізаванае прадстаўленне з удзелам калектываў мастацкай самадзейнасці, конкурс мастацкай творчасці вучняў нядзельных школ «Божыя іскрынкі», выстава работ майстроў раённага Дома рамёстваў і вясковых умельцаў, гульнёвая праграма «Цок-цыгірок» і інш. У гэты ж дзень Сенненскі РЦКіНТ арганізаваў у аграгарадку Полымя свята, таксама прысвечанае тром Спасам. У канцэртнай праграме былі задзейнічаны выканаўцы і мастацкія калектывы раёна. Экспанавалася выстава работ майстроў народнай творчасці раённага Дома рамёстваў, супрацоўнікі ЦБС зрабілі фотазону. Прайшло ўшанаванне лепшых працаўнікоў і жыхароў Беліцкага сельсавета.

19 жніўня ў г п. Падсвілле Глыбоцкага раёна мясцовых жыхароў і шматлікіх гасцей сабраў «Падсвільскі світанак», які адкрыўся тэатралізаванай замалёўкай «В некотором царстве, в Подсвильском государстве». У рамках свята адбылося тэатралізаванае прадстаўленне «Спорт+» з удзелам прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў пасёлка. Арганізатары прапанавалі гледачам канцэрт «Песні нашага двара», шоу-праграму «Па слядах цудоўнай сямёркі», «Падсвільскі хіт-парад», харэаграфічную замалёўку «Усходнія казкі» і шмат чаго іншага.